Отдел образования, спорта и тризма
Новобелицкого района г.Гомеля
Государственное учреждение образования
«Средняя школа №1 г.Гомеля»

Областной конкурс статей
«Судьбы детей Великой Отечественной войны 1941-1945 гг.»

# Эссе «Горкі смак шакаладу»

Автор:
Самусева Яна Олеговна,
13 лет, 11.01.2011г.р.
учащаяся 8«В» класса
Руководитель:
Толстихина Юлия Владимировна,
учитель белорусского языка и литературы
ГУО «Средняя школа №1 г.Гомеля»,
246042, г.Гомель, ул.Ильича, д.162А,
+375295398244, +375232292135

Гомель, 2024

Горкі смак шакаладу

Два гады таму не стала майго стрыечнага дзеда Алега. Гэта быў высокі чарнявы чалавек, з мяккай, нават дзіцячай усмешкай на твары. У нашай сям'і яго ўсе любілі, таму што яго любіла мая бабуля Валя- яго родная сястрычка. Гэта яна расказала мне пра дзяцінства свайго старэйшага брата.

Дзед Алег пражыў доўгае, складанае, цікавае жыццё. Але яго дзяцінства было апалена вайною.

Нарадзіўся хлопчык у лістападзе 1941 года ў старой, дрэнна пратопленай хаце. Маладая маці цешылася з сыночка, бо гэта была яе адзіная радасць. Гэта ўсё, што засталося ў яе ад мужа, якога забілі ў самым пачатку вайны. Ён нават не ўбачыў свайго сыночка.



*Вікулава Кацярына Захараўна з сынам Алегам*

Смерць ад кулі, голаду, хваробы некалькі разоў блізка падыходзіла да немаўляці. Але Алежак заставаўся жыць. …Першы раз ён мог загінуць, калі яму было ўсяго некалькі тыдняў ад нараджэння. У канцы лістапада ў старую хату ўвайшлі некалькі нямецкіх салдат.

Яны гучна размаўлялі паміж сабой, грукалі дзвярыма і заслонкай печы – нешта шукалі. Дзіця, якое спала ў калысцы, прачнулася ад шуму і заплакала. Тады адзін з салдат выстраліў у бок люлькі, але кулі трапілі ў сцяну, не зачапіўшы малога. Пасля гэтага здарэння мая прабабуля дастала з гарышча схаваны там абраз Маці Божай і адкрыта павесіла ў хаце. Абраз правісеў на покуці ўсю вайну.

…У пачатку 1942 года у веску прыйшлі карнікі. Каля вескі дзейнічаў невялікі партызанскі атрад. Таму за дапамогу партызанам фашысты подпалілі веску. Гарэлі амаль усе хаты. Жыхары вескі, хто паспеў, пабеглі у лес.

Прабабуля не паспела ўцячы. Тады яна прывязала малога хусткаю на свою спіну і спусцілася ў пограб, які земляным праходам быў звязаны з адрынай. Яна паўзком прабіралася па земляным ходзе, а над імі гарэла хата.

…Лета 1944 года. Мая прабабуля недзе ў полі, а малы хлопчык, якому яшчэ няма і трох гадоў, зачынены адзін у хаце. Як малое змагло выбрацца з хаты, ніхто не ведае… У вёску хлопчыка прынёс на руках

салдат Савецкай Арміі. Алежка салодка спаў, бо вельмі стаміўся: ён адышоў даволі далёка ад роднай хаты. Малы дабраўся да калгаснага поля, якое пры адступленні замініравалі фашысты. Зноў Бог і лёс выратавалі хлопчыка: савецкія салдаты працавалі над размінірваннем дарогі і кавалка калгаснага поля. Яны заўважылі маленькага хлопчыка і аднеслі яго ў вёску.

…У 1946 годзе ў пошуках лепшай долі прабабуля з Алежкам перабіраецца ў горад. Ранняя вясна. Холадна, голадна, вельмі цяжка. Але самае страшэннае, што хлопчык захварэў. У яго "крываўка". Алежык памірае. Яму вельмі дрэнна. Таблетак у прабабулі няма, а зёлкі, якія дала суседка, ужо не дапамагаюць. Прабабуля выносіць малога на веснавое сонейка, абкладвае падушкамі – хлопчык сам ужо не сядзіць. Раптам перад дзіцём спыняецца чалавек у вайсковай форме. Ён аглядае хлопчыка, нешта яму дае. Спалоханая прабабуля хутка выходзіць на двор. На кукішках перад хлопчыкам сядзіць ваенурач 2-га рангу. Мужчына абяцае прыйсці ўвечары, прынесці лекі і шчэ раз агледзець малога. На жаль, доктар не прыйшоў, але лекі перадаў праз нейкага салдата. Цэлых пятнаццаць парашкоў! Разам з парашкамі ён перадаў невялікую плітку шакаладу, на якой быў надпіс: "Даць толькі тады, калі цалкам ачуняе." Хлопец выжыў. Дзед Алег расказваў сваёй сястрычцы, маёй бабулі, што ён добра памятае смак той шакаладкі. Гэта быў першы шакалад у яго жыцці. А яшчэ расказваў, што ён яму вельмі не спадабаўся, бо быў нейкім горкім. Але маці прымушала яго з'ядаць па адной дольцы ў тры дні, кажучы, што гэта такія лекі, каб хлопчык ніколі больш не хварэў.



*Вікулаў Алег Іванавіч. 1946 год*

Дзед Алег пражыў доўгае жыццё – 78 гадоў. Усё жыццё ен працаваў – будаваў масты і дарогі. Я толькі аднойчы бачыла свайго дзеда Алега, бо ён жыў даволі далёка ад нас – у Забайкаллі. Ён прыехаў у госці да сваёй сястрычцы, маей бабулі, і прывёз у падарунак усім нам шакалад. Ён гаварыў, што шакалад – самыя лепшыя лекі ў жыцці…



*Вікулаў Алег Іванавіч. 1962 год*